Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Першамайскім судзе Мінска асудзілі ўдзельнікаў перадвыбарчых мітынгаў: агульная сума штрафаў 175 базавых дапоўнена

02.12.2019 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Суд Першамайскага раёна Мінска. Фота: naviny.by

Адміністрацыйныя працэсы над удзельнікамі акцый, якія адбываліся пад час выбарчай кампаніі, пачынаюцца сёння ў судзе Першамайскага раёна Мінска. Пачатак у 11.30.

На 2 снежня прызначаны разгляд спраў чатырох актывістаў, у дачыненні да якіх складзеныя пратаколы па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве):

Будуць судзіць **Дзяніса Красачку, Ніну Багінскую, Леаніда Кулакова** і **Вольгу Нікалайчык**.

Справу Дзяніса Красачкі разглядае суддзя **Анастасія Ляўкоўская.**

Красачка прыйшоў на суд з **Анатолем Лябедзькам**, у іх яшчэ будзе сведка **Мікалай Маслоўскі**. Актывіст збіраецца хадайнічаць аб тым, каб працэс праводзіўся ў судовай залі, а не ў кабінеце суддзі. Па справе з боку абвінавачання прысутнічаюць сведкі – два супрацоўнікі АМАП.



Красачка хадайнічае аб адводзе суддзі. Абвяшчаецца перапынак для прыняцця рашэння. Сведкамі выступаюць супрацоўнікі АМАПу **Ілля Лемантовіч і Павел Асовік**.

У выніку суд адмовіў у адводзе суддзі.

Суддзя зачытвае пратакол: Красачка парушыў парадак пікетавання, прыняў актыўны удзел у масавых мерапрыемствах, якія выходзяць па-за межы агітацыі, выкрыкваў "Жыве Беларусь".

Сам Дзяніс Красачка на гэта адказаў, што пад час выбараў акцыі рэгламентуюцца выбарчым кодэксам, а не законам аб масавых мерапрыемствах. Ён удзельнічаў у акцыі ў межах агітацыі кандыдата ў дэпутаты Маслоўскага, таму ён ўпэўнены, што ў яго дзейнасці няма парушэння закону аб масавых мерапрыемствах.

Выступае сведка Павел Асовік. Ён сказаў, што яму паведамілі на службе пра тое, што мерапрыемства, дзе выступаў Красачка, было несанкцыянаваным. Красачка цікавіцца ў супрацоўніка АМАПу: *"Як вы змаглі вызначыць, законна ці не мерапрыемства, дзе я выступаў? Гэта ўваходзіць у паўнамоцтвы тэрытарыяльнай выбарчай камісіі (але запыт вы туды не накіроўвалі). Вы павінны ахоўваць"*.

Суддзя аб'яўляе перапынак да 17.00.

Пасля перапынку суд прызнаў Дзяніса Красачку вінаватым у здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння і аштрафаваў яго на **25 базавых велічынь**.

Справу Ніны Багінскай разглядае суддзя **Таццяна Ліннік.**

Суддзя палічыла, што Ніна Багінская здзейсніла адміністрацыйнае правапарушэнне, і прызначыла ёй штраф **у 50 базавых велічынь.**

Вольгу Нікалайчык будзе судзіць **Ганна Ігнацьева.**

Актывістка не прыйшла на разгляд адміністрацыйнай справы. Сведкі – супрацоўнікі АМАПу **Місюлін** і **Трышкін**. Яны кажуць пра тое, што пад час свайго дзяжурства ўбачылі масавае мерапрыемства на Кастрычніцкай плошчы, а *"мерапрыемствы ж там забароненыя"*.

Вольгу Нікалайчык судзяць за ўдзел у масавым мерапрыемстве 16-га лістапада. У матэрыялах справы ў якасці доказа суд праглядае відэазапіс з акцыі… якая прайшла 8 лістапада. На відэа гучыць песня "Тры чарапахі". Дзве справы – за 8 лістапада і за 16 лістапада – аб'ядналі.

Вользе Нікалайчык суд прызначыў **штраф у 50 базавых велічынь**.

Справу Леаніда Кулакова разглядае **Святлана Чараповіч.**

Па ўсіх судах аб'яўлены перапынак да 17.00.

Леаніда Кулакова таксама прызналі вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве і пакаралі штрафам у памеры **50 базавых велічынь.**



Назіральнікі з'ехалі, пачалася зачыстка. Расклад судоў на снежань.

Пасля “вакханаліі” перадвыбарчай, падобна, у Беларусі пачынаецца вакханалія судовая. Праваабаронцы сабралі звесткі пра адміністрацыйны пераслед удзельнікаў акцый, якія адбываліся пад час выбарчай кампаніі

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася


Чарговай нагодай для ціску


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды атубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла аніжэльную стаху". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY